майстэрні, дзе асартымент дзівіць сваім багаццем. Тут ствараецца не толькі літургічнае адзенне для набажэнстваў, упрыгожанае традыцыйнай касцельнай вышыўкай, аплікацыямі, карункамі, шнурамі і пэндзлямі, але і абразы з вобразамі святых, якія ўпрыгожваюць храмы, а таксама хрысцільнае адзенне для немаўлят.

У гэтай майстэрні, дзе веды, уяўленне і фантазія зліваюцца разам, чалавечыя рукі робяць прыгажосць, увасабляючы жаданне заказчыкаў і служачы высокаму прызначэнню – упрыгожыць і ўзвялічыць святыя рытуалы.

Такім чынам, майстэрня стварае харугвы для храма, якія натхняюць вернікаў, арнаты, вышытыя з любоўю і майстэрствам. Тут дзверы заўсёды адкрыты не толькі для тых, хто прысвяціў сваё жыццё Богу, але і для ўсіх, чыё сэрца адгукаецца на духоўнае. У гэтай майстэрні кожны хрысціянін можа знайсці тое, што кране яго душу і ўпрыгожыць яго веру.


Літаратура:

1. Вера і творчасць [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://sacris.by/ru/content/4-about-us. – Дата доступу: 16.09.2024


## ЗАХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПІНСКАГА РАЁНА


**Дваранiновіч Д. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.


Актуальнасць дадзенай працы заключаецца у тым, што захаванне культурнай спадчыны – гэта важная задача, якая патрабуе комплекснага падыходу. Яна ўключае ў сябе не толькі матэрыяльныя аб'екты, такія як архітэктурныя помнікі, музеі і бібліятэкі, але і нематэрыяльныя каштоўнасці, такія як фальклор, традыцыйныя рамёствы, песні, танцы і мова.

У сучасным свеце, дзе культурныя традыцыі сутыкаюцца з выклікамі глабалізацыі і мадэрнізацыі, захаванне іх становіцца ўсё больш складаным. Аднак важна памятаць, асабліва маладому пакаленню беларусаў, што традыцыі не павінны быць застылымі ў мінулым. Яны могуць і павінны развівацца і трансфармавацца, адаптоўваючыся да зменлівых рэалій.

Адным з важных інструментаў захавання культурнай спадчыны з'яўляецца вывучэнне нацыянальных традыцый, правядзенне майстар-класаў, стварэнне музеяў і культурных цэнтраў. Усё гэта дапамагае перадаць каштоўнасці будучым пакаленням. Аналіз інфармацыю з інтэрнэт-рэсурсаў паказаў, што сучасныя тэхналогіі таксама могуць адыграць важную ролю ў



Репозиторий ГрГМУ

захаванні і папулярызацыі нацыянальных традыцый. Напрыклад, анлайн-платформы, відэа-ролікі і сацыяльныя сеткі могуць зрабіць даступнымі інфармацыю аб традыцыях і паказаць іх прыгажосць шырокай аўдыторыі.

Нацыянальныя культурныя традыцыі – гэта не проста рэлікты мінулага, але і каштоўны рэсурс для развіцця сучаснага грамадства. Яны могуць служыць крыніцай натхнення для творчасці, інавацый і сацыяльных зменаў. Яны могуць спрыяць умацаванню нацыянальнай ідэнтычнасці, развіццю турызму і культурнага абмену.

У Пінскім раёне беражліва захоўваюць традыцыі беларускага ткацтва [1].

Ткацтва на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца адным з самых старажытных і распаўсюджаных рамёстваў. Па археалагічных дадзеных, яго ўзнікненне адносіцца да III тысячагоддзя да н.э., да эпохі позняга неаліту каменнага веку.

Праведзенае апытанне жыхароў сельскай мясцовасці паказала, што калісьці ў кожнай хаце, пачынаючы з восені, пралі і ткалі жанчыны ўсіх узростаў. Ткацкі станок даўней быў у кожнай сялянскай сям'і.

Маладая дзяўчына абавязаная павінна была ўмець ткаць, так як асноўную частку яе пасагу складалі тканая вопратка, пасцельныя прыналежнасці, ручнікі, абрусы.

Тканінамі, якія выраблялiся ў хатніх умовах, разлічваліся за паслугі, іх абменьвалі на прадукты і іншыя прадметы ўжытку.

У Пінскім раёне ўзнавілі старадаўні звычай "Піліпаўскіх вячорак". Традыцыя вячорак цесна звязана з перадкалядным (Філіпавым) постам, які пачынаецца 28 лістапада і заканчваецца 7 студзеня. У гэты час жанчыны і дзяўчаты па вечарах збіраліся разам у адным з вясковых дамоў, каб папрацаваць і павесяліцца. Вяскоўкі звычайна пралі, вышывалі або займаліся нейкім іншым рукадзеллем, спявалі, танцавалі, жартавалі, гулялі ў гульні і распавядалі гісторыі. Зазіралі на вячоркі і хлопцы – для іх гэта была добрая магчымасць нагледзець сабе нявесту.

З часам такая традыцыя стала рэдкасцю ў сельскай мясцовасці. У Мерчыцкім цэнтры традыцыйнай культуры і побыту вырашылі ўзнавіць звычай, каб захаваць яго. Да гэтай работы абавязкова прыцягваюць дзяцей, каб яны ўбачылі, чым займаліся нашы продкі, шанавалі і захоўвалі традыцыі.

У Мерчыцах рэканструявалі "Піліпаўскія вячоркі" ў адной з залаў цэнтра традыцыйнай культуры і побыту. Жанчыны з фальклорнага калектыву "Палесяначкі" рукадзельнічаюць і спяваюць, іх мужчыны-калегі паклапаціліся аб музычным суправаджэнні. Адчуць на сабе атмасферу старажытнага звычаю змаглі і школьнікі [2].

Такім чынам, палешукі трапятліва ставяцца да захавання народных традыцый, каб не толькі не страціць тую спадчыну, якая засталася ад дзядоў, але і захаваць і перадаць яе малодым.

Літаратура:

1. В Пинском районе бережно сохраняют традиции белорусского ткачества [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ok.ru/group/54515266224197/topic/151404087953477. – Дата доступа: 11.09.2024



Репозиторий ГрГМУ

2. Старинный обычай проведения "Пiлiпаўскiх вячорак" воссоздали в Пинском районе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk.com/wall-144961270_25190. – Дата доступа: 11.09.2024

# СУВЯЗЬ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Жогла Г. У.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук, дац. Сіткевіч С. А.

Беларуская мова з’яўляецца адным з найважлівейшых элементаў нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа. Яе роля ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці не можа быць пераацэнена, бо мова не толькі адлюстроўвае культурную і гістарычную спадчыну, але і з’яўляецца асновай для развіцця нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці. У сучасных умовах, калі Беларусь імкнецца захаваць сваю незалежнасць і ўмацаваць дзяржаўныя інстытуты, пытанне захавання і развіцця беларускай мовы набывае асаблівую актуальнасць, разам з пытаннем карэляцыі мова – дзяржаўнасць.

Беларуская мова – старажытная праіндаеўрапейская мова, якая налічвае больш за дзесяць стагоддзяў свайго пісьменства. Але ж сучасны этап развіцця нашай мовы бярэ свой пачатак толькі ў XIX стагоддзі, з моманту, калі былі зроблены першыя спробы стварыць літаратурную мову з народных гаворак, распрацаваць першую беларускую граматыку.

Дзеля комплекснага разумення карэляцыі мова – дзяржаўнасць неабходна разгледзець у рэтраспектыве развіццё двух названых суб’ектаў.

Хараналогія развіцця беларускай мовы, складзеная на падставе работ Ф.М. Янкоўскага: *старажытнаславянскі перыяд (X – XIII ст.)*, *старабеларускі перыяд (XIII – XIX ст.)*, што ўключае ў сябе субперыяды ВКЛ і Рэчы Паспалітай (РП), Расійскай Імперыі, *сучасны перыяд (XIX ст. – наш час)*, які падзяляецца на наступныя субперыяды: пачатак XX стагоддзя, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, пад нямецкай акупацыяй, пасляваенныя часы, найноўшы час [1].

Храналогія развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці уключае наступныя этапы: *дадзяржаўны (V – IX ст.), старажытнарускі (IX – XIII ст.), ВКЛ (XIII – XVI ст.), Польска-Літоўскі (XVI – XVIII ст.), Расійская Імперыя (XIX – пач. XX ст.), Савецкі перыяд (1917 – 1991 гг.), Рэспубліка Беларусь (1991 г. – наш час)* [2].

Легка заўважыць, што кожны новы этап развіцця дзяржаўнасці больш-менш супадае з кожным новым этапам развіцця нашай мовы. Пры троху больш дэталёвым разглядзе гістарычнай кан’юнктуры, няцяжка заўважыць тую самую



Репозиторий ГрГМУ